Грунвальдскай бітве на баку братоў славян, Дарэчы, прымаў удзел у гэтай бітве і Ян Жыжка. – адзін з будучых лідэраў гусіцкага руху,

Апошні магчымы шлях запазычвання не толькі тактыкі будавання вагенбургаў, але ўжо разам з тым і тактычных навінак «гусіцкай вытворчасці» звязаны з імем ўжо згаданага намі Жыгімонта Карыбутавіча, які доўгі час ваяваў у чэшскіх землях на баку гусітаў і быў асабістым сябрам ЯнаЖыжкі.

Як вынік можна зазначыць, што абоз войска ВКЛ у XV–XVIст.ст. не значна адрозніваўся ад абозу іншых еўрапейскіх краін, увабраўшы ў сябе як традыцыі Усходу, так і традыцыі Захаду, а яго камплектаванне, забеспячэнне і ўнармаванне абозных парадкаў ажыццяўлялася згодна з тагачасным заканадаўствам.

**Літаратура**


1. *Дельбрюк Г.* История военного искусства в рамках политической.истории в 5 томах. – М.: Государственное военное издательство наркомата обороны СССР.1936-940.ТЗ. Средневековье,937.-514ст.
2. ПСРЛ. .Сиб,:Тип.Л, Н.Скороходова,1897.Т 11: Патриаршая или Никоновская летопись.-254ст.
3. Статут Вялікагакняства Літоускага1588: Тэксты. Даведкі. Каментарыі. /Беларус. Сав. Энцыкл. РэдІ.П.Шамякін і інш.- Мн.:БелСЭ,1989.-573ст.
4. Ян Длугош. Грюнвальдская битва.-М.:Изд. АН СССР. 1962.
5. *Бохан Ю. М.* Наёмнае войска у Вялікім княстве Літоўскім у ХУ–ХУ1стст.- Мінск:Інстытут історыі НАН Беларусі,2004.–92ст.
6. *Nowakowski A.* Spret taborowy, obozowy i przeprawowy// Polska technika wojskowa do 1500roku. Warszawa.1994.
7. Sprawy wojenne kiola Stefana Batorego, Dyjaryjusze, relacyje, listy i akta z lat 1576-1586. Zebrab i wydal X. Ignacy Polkowski. Krakow,1887.


## УЗАЕМААДНОСІНЫ Ў АСЯРОДКУ СЯЛЯНСКАЙ АБШЧЫНЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ


**Н. М. Карбалевіч**


Грамадскія традыцыі асновы беларускага этнасу – беларускага сялянства – маюць глыбокія карані. Яны фарміраваліся напрацягу стагоддзяў пад уплывам знешніх і ўнутраных фактараў і захоўваюць у сабе шматгадовы гістарычны досвед беларускага народа. Да таго ж грамадскія традыцыі ахопліваюць адну з самых цікавых сфераў чалавечага жыцця – сферу чалавечых адносін, а значыць, захоўваюць у сабе і агульначалавечы досвед. Сялянская абшчына таксама з'яўляецца мадэллю калектыўнага дзеяння, вывучэння якога прадстаўляе цікавы бок не толькі грамадства, але і псіхалогіі чалавека.

Пры напісанні працы на дадзеную тэму выкарыстоўвалася разнастайныя крыніцы і літаратура. У асобную групу можна вылучыць працы знакамітых беларускіх этнографаў канца ХІХ – пачатку ХХ ст. М.В. Доўнар-Запольскага і А.К.Сержпутоўскага. У творах М.В. Доўнар-Запольскага прыведзены цікавыя вызначэнні пэўных бакоў грамадскага ладу сялян. «Галоўная аснова абшчыны – адміністрацыйна-фінансавая арганізацыя»[5]. У творах А. К. Сержпутоўскага маляўніча апісаны грамадскія з'явы – бонда і сябрына, якія дазваляюць зрабіць вывады аб характары ўзаемаадносін сялян. Важнай крыніцай з'яўляецца праца «Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета», у якім фальклорныя творы пададзены без апрацоўкі. Творчая спадчына А. К. Сержпутоўскага таксама прадстаўлена ў кнізе У. К Касько «Палескі дзівасіл». Гэтыя фальклорныя дадзеныя дазваляюць вызначыць пэўны бок узаемаадносін сялянства на Палессі – самым архаічным рэгіёне Беларусі. Фальклорныя творы дазваляюць адзначыць, перш за ўсё, маральна-этычны бок узаемаадносін. (Беларускі фальклор: хрэстаматыя. Склад. К. П. Кабашнікаў. – Мн., 1985). Насычаным інфармацыяй з'яўляецца зборнік Ліса А.С. «Жніўныя песні». У фальклорных жніўных песнях выражаны народны погляд на чалавека, працу, прыроду, сацыяльная этыка іх стваральнікаў, самы псіхалагічна-змястоўны вобраз чалавека, працы, які ўзнікае на шырокім прыродным і сацыяльным фоне[8, с.7]. Быў у якасці крыніцы выкарастаны таксама Статут ВКЛ: для вызначэння сацыяльнага і прававога становішча сялянства, месца копных судоў у агульна-дзяржаўнай судовай сістэме. Асобны бок выкарыстанай літаратуры складаюць калектыўныя творы-даследаванні сучасных беларускіх этнографаў: «Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі» (В. К. Бандарчык, Л. І. Мінько, Г. І. Каспяровіч і інш.), Шосты том «Грамадскія традыцыі» з серыі «Беларусы» (Мн. 2002). У параграфе, які апісвае абшчынныя перажыткі ў сучасным грамадстве, я карысталася і ўласнымі назіраннямі, якія праводзіліся ў вёсцы Балотчыцы Слуцкага раёна Мінскай вобласці.

Сялянская абшчына на беларускіх землях існавала не адно стагоддзе, але працэс фарміравання абшчынных прынцыпаў з'яўляецца яшчэ больш працяглай з'явай і сваімі каранямі адыходзіць у далекую мінуўшчыну. Безумоўна, працэс стварэння паўнавартаснай шматбаковай грамадскай сістэмы не можа быць аднамомантавым, таксама ён утрымлівае на сабе розначасовыя наслаенні, што робіць практычна немагчымым дакладнае вызначэнне часу з'яўлення абшчыны. На Беларусі ворыўнае земляробства было вядома яшчэ ў канцы І – пач. ІІ ст. н.э.[3, с.16]. Гэты тэрмін толькі ўмоўна можна лічыць часам узнікнення сельскай абшчыны. А

паколькі беларускі край здаўна быў земляробчым, і менавіта земляробства адыгрывала галоўную ролю ў жыцці людзей гэта адкрывала шлях да трывалага ўмацоўвання калектыўнай сістэмы, шлях да ўдасканальвання ўсіх элементаў гэтай сістэмы, шлях, які цягнуўся праз стагоддзі.

Важную ролю ў жыцці грамады адыгрывалі органы самакіравання і судовая сістэма, наяўнасць якіх дазваляе вылучаць грамаду як грамадска-палітычную адзінку. Органы самакіравання асобных сельскіх грамад узначальвалі старцы, старшыні, якія з’яўляліся асноўнымі збіральнікамі агульных падаткаў, што ішлі дзяржаве ці феадалам ад усёй вёскі. На пасаду старцаў, стараст выбіраліся найбольш паважаныя і заможныя асобы з сялянскага асяроддзя. Асноўную ролю ў абранні на пасаду адыгрывала не толькі матэрыяльнае становішча чалавека, але і яго аўтарытэт сярод аднавяскоўцаў. З гэтага можна адзначыць сацыяльную справядлівасць гэтай сістэмы, паводле якой прывілеяванае становішча старасты абапіралася ў асноўным на грамадскую думку, якая дастаткова рухома рэгулявала сістэму і не дазваляла наяўных злоўжыванняў. Старцы, старшыні выбіраліся сялянамі на абшчынных так званых копных сходах. На грамадскіх сходах сяляне размяркоўвалі падаткі, службовыя і іншыя абавязкі, вызначалі тэрмін сельскагаспадарчых прац, карыстанне лугамі, лясамі, разбіралі розныя пытанні грамадскага жыцця. Менавіта таму ўлада ў грамадзе мела калектыўны характар. Аднак калектыўны характар грамадскай улады абмяжоўваўся шэрагам палавых, узроставых і маёмасных умоў. Вялікім аўтарытэтам у грамадзе карысталіся старыя людзі, дзеці якіх ужо самастойна гаспадарылі. Гэтыя сяляне ўтваралі так званую «раду старэйшын»[3, с.46].

Акрамя грамадскай думкі ў грамадзе існавала ўнармаваная судовая сістэма, заснаваная на звычаёвым праве. У ёй таксама рэалізавалася патрэба сялян у грамадскай дзейнасці. Суды чыніліся на сельскіх сходах, на якія збіралася дарослае мужчынскае насельніцтва сяла. Прысутнасць на капе лічылася грамадскім абавязкам, за няяўку без уважлівай прычыны спаганялі штраф. Народнае судаспраўаводства не ведала закрытых працэсаў, яны праходзілі заўсёды публічна, што выключала магчымасць злоўжыванняў і памылак суб’ектыўнага характару. Правасуддзе, па сутнасці, вяршылася ўсімі прысутнымі. Грамадзянскае права на абарону незалежна ад маёмаснага і саслоўнага стану меў кожны жыхар воласці без якіх-небудзь абмежаванняў. Судаводства мела шматпрыступкавую структуру, якая дазваляла дэталёва разгледзець справу і пазбегнуць пэўных памылак, паколькі кожная са стадый была рэгламентаванай і галоснай. Пры вынясенні прысуду капа заўсёды

ўлічвала рэпутацыю злачынцы і гэта ўплывала на ступень жорсткасці пакарання. Па прычыне таго, што абшчына з'яўлялася вытворчай адзінкай, абавязковым быў прынцып выплаты шкоды.

Грамада ўяўляла сабой складаны грамадска-вытворчы арганізм. Эканамічныя адносіны мелі істотны, вызначальны характар. Асновай узаемаадносін былі пазямельныя адносіны. Адзіным уладальнікам зямлі была абшчына. Унутры абшчыны зямля размяркоўвалася паміж дымамі і службамі. Такім чынам, можна вылучыць асаблівую форму ўласнасці на зямлю – грамадска-прыватную. Абшчына з'яўлялася адзінкай падаткаабкладання. Вызначаўся аб'ём падаткаў для кожнай абшчыны. Потым ён размяркоўваўся старастамі паміж абшчыннікамі. Праблема сацыяльнай дыферэнцыяцыі згладжвалася сацыяльна справядлівай сістэмай размеркавання падаткаў. Такім чынам, адносіны ў абшчыне не былі чыста вытворча-эканамічнымі. Іх можна вызначыць як грамадска-эканамічныя. «Працуй грамадой – не будзеш з бядой»[1]. На падставе сутнасці абшчынных адносін можна вылучыць шэраг грамадска-эканамічных з'яў у асяродку абшчыны: бонда, талака, сябрына.

Сістэма поглядаў асобнага чалавека на свет і сваё месца ў ім фарміравалася з дзяцінства і адпавядала пануючым у асяродку абшчыны тэалагічным і матэрыялістычным уяўленням, этычным нормам. «Хітрэй свету не будзеш»[9, с.120]. «Самасуд – не суд», «Зробіш ліхое, й душа не на месцы», «Сядзіш у радку, цягні бяду», «Як людзі, так і мы» [7, с.224].

Амаль ва ўсіх сферах абшчыннай сістэмы праяўляўся пэўны дуалізм. Грамада, па-першае, заўсёды абараняла інтарэсы селяніна, адстойвала яго правы перад дзяржавай, але з цягам часу абшчына пераўтварылася ў ніжэйшае звяно дзяржаўна-адміністрацыйнай сістэмы. Па-другое, дваістасць землекарыстання. Селянін быў землеўладальнікам вылучаецца толькі ў межах абшчыны; адзіным землеўласнікам выступала грамада. Па-трэцяе, дваістымі былі і пэўныя маральныя нормы. Пэўныя злачынствы, якія лічыліся ганьбай у адносінах да суабшчынніка, «дазваляліся» ў адносінах да дзяржаўцаў і паноў-землеўласнікаў і называліся кемлівасцю. «Хто пану не схлусіць, а паню не падмане, той у сваёй гаспадарцы не гаспадар, а пуспога двара затычка»[7, с.333]. У пэўнай ступені гэтую дваістасць можна патлумачыць сутнасцю абшчыны. Абшчына з'яўлялася карпаратыўным сялянскім утварэннем, своеасаблівым адасобленым светам. Акрамя ўнутранных узаемадзеянняў гэты свет павінен быў мець стасункі і з навакольным асяроддзем, а для гэтага трэба было выпрацаваць пэўную сістэму ўзаемаадносін з наваколлем, што і было зроблена.

Грамада – гэта ўрэгуляванае сялянскае ўтварэнне, вытворчая, сацыяльна-эканамічная, грамадска-палітычная, культурная, этнічная ў нейкім сэнсе, маральная адзінка грамадства, асобны ўнармаваны свет, жывы арганізм, які імкнуўся самастойна жыць па сваіх законах. Грамада, абшчына для селяніна была адзінай магчымасцю заняць сваё пэўнае месца ў грамадстве. У абшчынных адносінах вызначаюцца крыху хваравітыя адносіны да маёмасці, але гэта можна патлумачыць хутчэй цяжкім становішчам сялян, чым іх карыслівымі меркаваннямі. «А нашы людзі бедныя:/ Ядуць хлеба па крышацы/ А п'юць вады па лыжаццы»[8]. Нельга глядзець на абшчыну, як на нешта спрошчанае, прымітыўнае, бо яна прыклад складаных грамадскіх узаемаадносін. І толькі цалкам натуральнае ўтварэнне можа так арганічна ахопліваць усе сферы жыцця, дапамагаць складанаму існаванню. Абшчына ніколі не супрацьстаяла асобе чалавека, які заўсёды меў права выказаць свае думкі, з дапамогай звычаю ці добрых людзей даказаць сваю справядлівасць. Заўсёды вельмі моцнымі былі маральныя асновы абшчыны, калі літасць перамагае карыслівы інтарэс, а інакш і немагчыма, бо людзі, якія складалі абшчыну, заўсёды цяжка працавалі на зямлі, якая не церпіць падману, ілжывасці, несумленнасці.

Асноўнымі падставамі для захавання пэўных абшчынных рыс у сучасным сялянскім асяродку з'яўляецца захаванне месцаў агульнага пасялення сялян – вёсак, а таксама трываласць рысаў, якія складваліся стагоддзямі і трывала замацаваліся ў сялянскім менталітэце. І сёння ў ХХІст. можна ўбачыць у нашых вёсках, нават немагчыма сказаць, рэшткі мінулага, гэта хутчэй асновы, чым адбіткі.

У пэўнай ступені традыцыі і звычаі беларускага сялянства з'яўляюцца асновай узаемаадносін беларускага народа. І захоўваюць яны шматгадовую мудрасць і досвед народа. Ёсць падставы лічыць, што пэўныя рысы абшчынных узаемаадносін могуць стаць трывалай падставай для фарміравання і развіцця пэўных грамадскіх інстытутаў сучаснага беларускага грамадства.

### Літаратура


1. Беларускі фальклор: хрэстаматыя. Склад. *К. П. Кабашнікаў.* – Мн.: Выш. шк., 1985. – 749с.
2. Беларусы. Т.6: Грамадскія традыцыі. – Мн.: Бел. навука, 2002. – 605с.
3. Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі/ *В. К. Бандарчык, Л. І. Мінько, Г. І. Каспяровіч* і інш. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 256с.:іл.
4. *Довнар-Запольский М. В.* История Белоруссии/ *М. В. Довнар-Запольский.* – 2-е изд. – Мн.: Беларусь, 2005. – 680с.
5. *Довнар-Запольский М. В.* Западнорусская сельская община в XVIв. – СПб., 1897.

6. *Довнар-Запольский М. В.* Очерки по организации западнорусского крестьянства в XVIв. – Киев., 1905.
7. *Касько У. К.* Палескі дзівасіл: Бел. нар. прыказкі, прымаўкі, выслоўі: са скарбніцы *А. К. Сержпутоўскага/ У. К. Касько*. – Мн.: Выш. шк., 2005. – 383с.
8. *Ліс А. С.* Жніўныя песні. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 238с.
9. *Сержпутоўскі А. К.* Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета. – Мн.: Універсітэцкае, 2000. – 270с.
10. *Сержпутовский А. К.* Очерки Белоруссии// Живая старина. СПб., 1907. Вып. 3,4.
11. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588/ Пер. на бел. мову *А. С. Шагун.* – Мн.: Беларусь, 2005. – 207с.: іл.
12. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989.

## КАНЦЫЛЯРЫЯ ГУБЕРНАТАРА ЯК ОРГАН ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 30–50 гг. XIX ст.

**Г. С. Кліз**

На губернатара была ўскладзена вялікая колькасць спраў і абавязкаў. Зразумела, што адной асобе іх нельга было адолець, таму кіраванне губерняй губернатар ажыццяўляў пры дапамозе спецыяльнай канцылярыі і чыноўнікаў для асобых даручэнняў. Апошнія займаліся найбольш важнымі для начальніка губерні справамі: расследаваннем службовых злоўжыванняў і беспарадкаў, рэвізіямі дзяржаўных устаноў, выкананнем сакрэтных распараджэнняў і г.д [4, арк. 48]. Губернская канцылярыя з’ўлялася сувязным звяном губернатара з падначаленымі ўстановамі і з вышэйшымі органамі ўлады імперыі.

Служачыя канцылярыі знаходзіліся ў вядзенні губернатара і падначальваліся непасрэдна яму. Назначэнне і звальненне гэтых чыноўнікаў залежала ад губернатара. Толькі чыноўнікі для асобых даручэнняў пры ім назначаліся і звальняліся па зацвярджэнню міністра ўнутраных спраў [7, арт. 647].

Штат канцылярыі зацвярджаўся Сенатам [5, № 17112]. Прыкладны склад канцылярыі губернатара можна разгледзець на аснове дадзеных аб канцылярыі віцебскага губернатара. Так, на падставе штата 1845 г., яго канцылярыя складалася з правіцеля канцылярыі, 3 старшых і 3 малодшых памочнікаў правіцеля канцылярыі і рэгістратара. Акрамя таго, пры губернатары знаходзіліся 2 старшыя і 2 малодшыя чыноўнікі для асобых даручэнняў, якія атрымоўвалі жалаванне па штату, 1 старшы і 1 малодшы без жалавання. З адпушчаных па штату сродкаў адна частка выкарыстоўвалася на выдачу платы 12 штатным чынам, а з астатняй сумы ўтрымліваліся 10 канцылярскіх служачых і пісараў, якія знахо-